Чыста жахлівае

Новыя зьвесткі пра маскавіта
які некалькі дзён таму, у Кароне
Польскай, Полацк – славуты горад
і крэпасьць Літоўскай зямлі,
з жудасным дэспатызмам захапіў
і перамог, у выглядзе
жалобнага вершу
складзеныя

Ёганам Райнхардам
Гравінгеліем

Год 1563.

+

Літасьціваму і добра адукаванаму Даві-
ду Райнхарду, **у аўгустынскі калегіюм**
у Эрфурце, Майму добраму
любаму брату.

БОСКАЙ ласкі праз Хрыста перад усім. Добры любы брат, з брацкай любові я не магу ўтрымаць ад цябе, што некалькі дзён таму сюды ў Прусію прышлі вельмі жахлівыя Новыя зьвесткі з Літвы, а менавіта пра тое, як маскавіты з насамрэч вялікім войскам уварваліся ў пазначаную зямлю і нядаўна захапілі і перамаглі Полацк, які мусіць быць славутым гандлёвым горадам і крэпасьцю, таксама ўчынілі і зьдзейсьнілі там жудасныя забойствы і дэспатызм. Падобнага плачу, калі Бог міласэрна не ўратуе, прадбачым і чакаем мы тут у Прусіі таксама ў хуткім часе. Той плач славутага горада Полацка я склаў у простым жалобным вершы і перасылаю яго табе, і прашу пры гэтым, каб ты пажадаў разам з іншымі годнымі хрысьціянамі ад усяго сэрца заклікаць да Бога, вернага Дапаможніка, каб ён быў літасьцівы да нас і з Бацькоўскай дабрыні і спагады пажадаў адвесьці ад нас, няшчасных грэшнікаў, справядліва заслужанае пакараньне, амэн. На гэтым, будзь здаровы, і суцяшай нашага старага пажылага айца. Кёнігсберг у Прусіі, на дабравешчаньне Марыі, год 1563.

Т.Л.Б.

Ёган Райнхард
Г.

Жалобны плач горада Полацка.

БОГ сьхіліў да мяне сваё сэрца,
І выказаў мне вялікую ласку.
Тым што ён даў мне цела і жыцьцё,
І цудоўны спакой.
З гэтага можна была б добра ўбачыць,
Што кожны павінен быць пабожным.
Аднак я пагарджаўся гэтым,
І дрэнна праводзіў свае дні.
У жратве, пьянстве, блудзе,
У фанабэрстве і шматлікім махлярстве.
У ліхвярстве, скупасьці і таксама ў падмане,
Нават гэтага мне бы хапіла.
Не адказвайце на мае наступныя пытаньні,
Не клапаціцеся пра тое, што скажа мне на гэта Бог.
Падсумуй, я рабіў мала пакаяньняў,
Таму я мушу цяпер пакутваць.
І бачыць такое гора,
Якое ніводны чалавек не можа вымавіць.
Вось праз варожую руку
Забранае ўсё, што было маім.
Вось пакутуе мая жанчына і дзіця,
І ўсё, што можна знайсьці ў мяне.
Адчуйце вельмі вялікую скруху,
Шмат смутку і журбы.
Адна частка згубіла сваю кроў,
Другой без яе дрэнна.
Шмат вас закавалі ў ланцугі,
І ўвялі ў далечыню.
А сярод маскавітаў нікога,
Хаця гэта яны мусілі трапіць у палон.
Хаця гэта яны мусілі цярпець гора і
Нястачу, і нарэшце нават сьмерць.
О, ты, нежная цнатлівіца,
Як растапталі тваю нявіннасьць.
Бо ў цябе адабралі такі скарб,
Які ты ніколі ня можаш вярнуть.
Ах, каб толькі пакараў мяне Гасподзь
Чумой, і ўсталяваў мір.
Каб я не быў, як я зараз,
Цалкам засмучаны ў маёй душы.

Бо мусіць ужо спыніцца шматлікае гора,
Якое бачыла маё сэрца.
Я зранены ляжу перад усім сьветам.
Разам са мной знайшлі канец золата і грошы.
Я раней і не думаў,
Што Бог настолькі поўнасьцю на мяне
Павінен выліць свой гнэў,
Які часта цёк на мяне.
Каб я даўно зрабіў пакаяньне,
То мне не было б так дрэнна.
Каб я надзеў мяшок,
І пасыпаўся попелам.
І каб аплакаў усе мае грахі,
То вораг так не душыў бы мяне.
То мае справы былі безумоўна лепшымі,
О, гора, гора, ах і ах.
Каб маглі размаўляць усе зоры,
І кроплі вада мелі языкі.
То яны б не маглі дастаткова мае пакуты
Ў гэты час апісаць.
Ды калі разам увесь пясок каля мора
Поўнасьцю быў поўны языкоў.
І каб маглі размаўляць лісты і травы,
І ўсё, што Бог стварыў.
То яны б не маглі выказаць,
Тое няшчасьце, якое прыйшло да мяне ў хату.
Дык гэта не цуд, што я плачу,
І толькі дарма кроплі крыві скуголяць.
Над той бядой, у якой я знаходжуся,
І якую бачу зараз перад маімі вачыма.
У маіх нямецкіх наймітаў вораг
Адняў так проста ўвесь гандаль.
Кожны глядзіць на мяне,
На тое, чаго ён ніколі ня зьведае.
Тое няшчасьце, ў якім я зараз,
Ах, куды ж мне ўцякаць.
Мне здаецца, Бог свой твар
Адвярнуў ад мяне і не чуе мяне.
Выпрамлюся я, сагнуся ўніз,
Павярнуся ў бок, вярнусь назад.
І не знайду ані дапамогі, ані парады,
Усё гэта робіць мая правіна.
Якую я ў сябе не заўважыў,
І хутка адвярнуўся ад яе.

Менавіта таму кожны мусіць сьцерагчы сябе,
Калі ён не хоча перажыць падобнае няшчасьце.
Якое я цяпер перажыў,
Тое я зараз абвяшчаю ўсім людзям.
І асабліва гэтай прусскай зямлі
Мусіць быць вядомы мой смутак.
Бо вораг вельмі трыумфуе,
Мяркую Нямеччыну таксама будзе наступнай.
І пагэтаму без сораму
Я раблю ад усяго сэрца пакаянне за твае грахі.
Слухайце старанна слова Бога,
І калі вы пачуеце яго
То прыміце яго з усёй сурьёзнасьцю,
І галасіце добрасумленна ў яго сэрца.
А потым жывіце таксама на зямлі,
Такім чынам усе справы будуць добрыя.
Бо калі чалавек вернецца да Бога,
То ён зьведае вялікую ласку.
Аднак калі чалавек не зробіць гэта,
То гэта адведае нарэшце чалавечая кроў.
Урад пануйце стала
І бараніце тое, што вы павінны бараніць.
І карайце з суворасцю махлярства,
І мейце чыстае сумленьне.
Каб пабожны мог мець спакой
На зямлі і таксама ў дадатак мір.
Падданыя вельмі жадаюць
Быць паслухмянымі ўраду.
Бо ГАСПОДЗЬ прызначыў іх
Сваёй міласэрнай мудрай парадай.
Таксама дзеці са стараньнем жадаюць
Рабіць паводле слоў сваіх бацькоў.
Таму любы Бог гэта
Запаветаў у чацьвёртым запавеце.
І тыя, што атрымалі стан бацькоў,
Які таксама заснаваны ГОСПАДАМ,
То на айцэ і маці ляжыць,
Што яны гадуюць сваіх дзяцей
У сапраўднай пакорлівасьці
Да страху перад Богам і прыстойнасьці.
Будзь ты парабкам, ці парабчанкай,
Табе прадпісана служыць.
То будзь верным тваім панам і пані,
Думай, што за гэтым назірае твой Бог.

Які дакладна можа ў любы час даць табе
Багатую ўзнагароду за верную службу.
Падсумуў паўсюль тое,
Чым ты спадабаўся Богу.
Такім чынам ГАСПОДЗЬ будзе стрыжням,
Які не выкідаюць у вагонь.
І адвядзе пакараньне і пакуты,
Якія б ты інакш сувора атрымаў.
Калі ты ня вернешся да БОГА
І не адкінеш вялікія грахі.
Сапраўдна бедны засмучаны горад,
Прымі маю верную параду.
Жадай з радасьцю таго, што ува мне
ўвесь час бачылі ўсе.
І паляпшай са стараньнем і роўнасьцю
Сваё злое і грахоўнае жыцьцё.
Таму, дарагія сябры, адкладзіце
Сёньня рамяство цемры
І вазьміце зброю сьвятла,
Немагчыма пажадаць вам нічога лепей.
Кожны няхай старанна прыводзіць сябе
Да файнага жыцьця і прыстойнасьці.
Не жраць і напівацца шмат,
Не тое, чаго жажае яго стары Адам,
Але ў сваёй умеранасьці
Няхай трымае сябе ў кожны час.
Такім чынам Семя Жанчыны
Памілуе вас. Амэн.

БОГ сэрца сваё схіліў да мяне
І ласку вялікую выказаў мне.
Праз тое, што цела стварыў ён маё,
Спакой дараваў і самое жыцьцё.
Праз гэта вы можаце ўбачыць яскрава,
Што набажным быць, гэта кожнага справа.
Але пагарджаўся я гэтым, сябры,
І дрэнна праводзіў свайго жыцьця дні.
У распусьце, абжорстве ды жудасным пьянстве,
У фанабэрстве сваім і шматлікім махлярстве.
У ліхвярстве, і скупасьці разам з падманам,
Аднаго толькі гэтага мне ўжо навалам.
Свае вушы закрыйце на гэты патаньні,
Не важна якія Бог дасьць мне пакараньні.
Падсумуй, я рабіў пакаяньняў так мала,
За гэта цяпер мне пакутаў навала,
І глядзець я прымушан на гэткае гора,
Што яго вам ніхто растлумачыць ня здоле.

Вось праз варожую руку
Забранае ўсё, што было маім.
Вось пакутуе мая жанчына і дзіця,
І ўсё, што можна знайсьці ў мяне.
Адчуйце вельмі вялікую скруху,
Шмат смутку і журбы.
Адна частка згубіла сваю кроў,
Другой без яе дрэнна.
Шмат вас закавалі ў ланцугі,
І ўвялі ў далечыню.
А сярод маскавітаў нікога,
Хаця гэта яны мусілі трапіць у палон.
Хаця гэта яны мусілі цярпець гора і
Нястачу, і нарэшце нават сьмерць.
О, ты, нежная цнатлівіца,
Як растапталі тваю нявіннасьць.
Бо ў цябе адабралі такі скарб,
Які ты ніколі ня можаш вярнуть.
Ах, каб толькі пакараў мяне Гасподзь
Чумой, і ўсталяваў мір.
Каб я не быў, як я зараз,
Цалкам засмучаны ў маёй душы.
Бо мусіць ужо спыніцца шматлікае гора,
Якое бачыла маё сэрца.
Я зранены ляжу перад усім сьветам.

Разам са мной знайшлі канец золата і грошы.
Я раней і не думаў,
Што Бог настолькі поўнасьцю на мяне
Павінен выліць свой гнэў,
Які часта цёк на мяне.
Каб я даўно зрабіў пакаяньне,
То мне не было б так дрэнна.
Каб я надзеў мяшок,
І пасыпаўся попелам.
І каб аплакаў усе мае грахі,
То вораг так не душыў бы мяне.
То мае справы былі безумоўна лепшымі,
О, гора, гора, ах і ах.
Каб маглі размаўляць усе зоры,
І кроплі вада мелі языкі.
То яны б не маглі дастаткова мае пакуты
Ў гэты час апісаць.
Ды калі разам увесь пясок каля мора
Поўнасьцю быў поўны языкоў.
І каб маглі размаўляць лісты і травы,
І ўсё, што Бог стварыў.
То яны б не маглі выказаць,
Тое няшчасьце, якое прыйшло да мяне ў хату.
Дык гэта не цуд, што я плачу,
І толькі дарма кроплі крыві скуголяць.
Над той бядой, у якой я знаходжуся,
І якую бачу зараз перад маімі вачыма.
У маіх нямецкіх наймітаў вораг
Адняў так проста ўвесь гандаль.
Кожны глядзіць на мяне,
На тое, чаго ён ніколі ня зьведае.
Тое няшчасьце, ў якім я зараз,
Ах, куды ж мне ўцякаць.
Мне здаецца, Бог свой твар
Адвярнуў ад мяне і не чуе мяне.
Выпрамлюся я, сагнуся ўніз,
Павярнуся ў бок, вярнусь назад.
І не знайду ані дапамогі, ані парады,
Усё гэта робіць мая правіна.
Якую я ў сябе не заўважыў,
І хутка адвярнуўся ад яе.
Менавіта таму кожны мусіць сьцерагчы сябе,
Калі ён не хоча пераажыць падобнае няшчасьце.
Якое я цяпер пераажыў,

Тое я зараз абвяшчаю ўсім людзям.
І асабліва гэтай прусскай зямлі
Мусіць быць вядомы мой смутак.
Бо вораг вельмі трыумфуе,
Мяркую Нямеччыну таксама будзе наступнай.
І пагэтаму без сораму
Я раблю ад усяго сэрца пакаянне за твае грахі.
Слухайце старанна слова Бога,
І калі вы пачуеце яго
То прыміце яго з усёй сурьёзнасьцю,
І галасіце добрасумленна ў яго сэрца.
А потым жывіце таксама на зямлі,
Такім чынам усе справы будуць добрыя.
Бо калі чалавек вернецца да Бога,
То ён зьведае вялікую ласку.
Аднак калі чалавек не зробіць гэта,
То гэта адведае нарэшце чалавечая кроў.
Урад пануйце стала
І бараніце тое, што вы павінны бараніць.
І карайце з суворасцью махлярства,
І мейце чыстае сумленьне.
Каб пабожны мог мець спакой
На зямлі і таксама ў дадатак мір.
Падданыя вельмі жадаюць
Быць паслухмянымі ўраду.
Бо ГАСПОДЗЬ прызначыў іх
Сваёй міласэрнай мудрай парадай.
Таксама дзеці са стараньнем жадаюць
Рабіць паводле слоў сваіх бацькоў.
Таму любы Бог гэта
Запаветаў у чацьвёртым запавеце.
І тыя, што атрымалі стан бацькоў,
Які таксама заснаваны ГОСПАДАМ,
То на айцэ і маці ляжыць,
Што яны гадуюць сваіх дзяцей
У сапраўднай пакорлівасьці
Да страху перад Богам і прыстойнасьці.
Будзь ты парабкам, ці парабчанкай,
Табе прадпісана служыць.
То будзь верным тваім панам і пані,
Думай, што за гэтым назірае твой Бог.
Які дакладна можа ў любы час даць табе
Багатую ўзнагароду за верную службу.
Падсумуў паўсюль тое,

Чым ты спадабаўся Богу.
Такім чынам ГАСПОДЗЬ будзе стрыжням,
Які не выкідаюць у вагонь.
І адвядзе пакараньне і пакуты,
Якія б ты інакш сувора атрымаў.
Калі ты ня вернешся да БОГА
І не адкінеш вялікія грахі.
Сапраўдна бедны засмучаны горад,
Прымі маю верную параду.
Жадай з радасьцю таго, што ува мне
ўвесь час бачылі ўсе.
І паляпшай са стараньнем і роўнасьцю
Сваё злое і грахоўнае жыцьцё.
Таму, дарагія сябры, адкладзіце
Сёньня рамяство цемры
І вазьміце зброю сьвятла,
Немагчыма пажадаць вам нічога лепей.
Кожны няхай старанна прыводзіць сябе
Да файнага жыцьця і прыстойнасьці.
Не жраць і напівацца шмат,
Не тое, чаго жажае яго стары Адам,
Але ў сваёй умеранасьці
Няхай трымае сябе ў кожны час.
Такім чынам Семя Жанчыны
Памілуе вас. Амэн.